**“Кніжная спадчына Францыска Скарыны” (2013–2017 гг.)**

Міжнародны навуковы і выдавецкі праект па перавыданні і прадстаўленні сусветнай супольнасці кніжнай спадчыны Францыска Скарыны, рэалізаваны на працягу 2013–2017 гг. Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі пры фінансавай падтрымцы Банка БелВЭБ. Вынікам праекта з’яўляецца каштоўнае 21-томнае факсімільнае выданне, якое максімальна поўна ўзнаўляе кнігі Францыска Скарыны: захаваны асаблівасці шрыфтоў і гравюр арыгінальных выданняў, перададзены ўсе штрыхі, набытыя на працягу 500-гадовага існавання. Асновай для стварэння факсіміле сталі электронныя копіі найлепшым чынам захаваных кніг беларускага першадрукара, якія знаходзяцца ў бібліятэках і музеях Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі і іншых краін. Перавыдадзеныя кніжныя шэдэўры суправаджаюцца ўпершыню падрыхтаванымі перакладамі прадмоў і пасляслоўяў Францыска Скарыны на сучасныя беларускую, рускую і англійскую мовы. Факсіміле было перададзена ў дар навуковым, навучальным, духоўным, культурным установам Беларусі і многіх іншых краін свету. На XVI Міжнародным з’ездзе славістаў, які прайшоў у Сербіі у 2017 г., беларускае факсімільнае ўзнаўленне кніжнай спадчыны Францыска Скарыны прызнана адным з лепшых выданняў апошняга часу ў славянскім свеце. У студзені 2018 г. калектыў Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі стаў лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне” за працу па факсімільным аднаўленні і папулярызацыі кніжнай спадчыны Францыска Скарыны.